**Вішнеўская, В.** Пераемнасць пакаленняў / В. Вішнеўская // Міёрскія навіны. — 2013. — 23 лют. — С. 5.

## ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ



**За плячыма Валерыя Вячаслававіча Мажынскага – армія і Афганістан. Яшчэ атрымліваючы ў тэхнікуме спецыяльнасць тэхніка-механіка, куды паступіў у 1979 годзе, ён трапіў у спецнабор, служыў спачатку ў Латвіі ў Гайджупаі ў паветрана-дэсантных войсках. Скачкоў з парашутам здзейсніў больш за дзесяць.**

Калі аб'явілі набор добраахвотнікаў у Афганістан, малады салдат праявіў ініцыятыву: спачатку служыў ахоўнікам, патруляваў тэрыторыю дзяржаўнай важнасці – палац прэзідэнта. Змянілася ўлада, і пачаліся баявыя дзеянні. Валерый Вячаслававіч праз некаторы час быў пераведзены на мяжу з Пакістанам у Кандагар. Там асноўнай задачай салдат з'яўлялася затрыманне «шкодных» караванаў, якія дастаўлялі душманам зброю. «Ідучы на заданне, ніколі не ўзнікала думкі, што мог загінуць ці быць параненым, атрымліваў загад – і яго выконваў», – дзеліцца мінулымі перажываннямі афганец. Скончылася вайна і служба, але ў памяці такія падзеі застаюцца назаўсёды. У сямейным архіве з часоў службы захавалася некалькі фотаздымкаў, упрыгожаных дадатковымі малюнкамі. З узнагарод – Пахвальны ліст за прыкладную дысцыпліну і добрасумленную службу, занясенне ў Ганаровую кнігу часці, у якой служыў; грамата Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за выкананне інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане.

Вярнуўшыся на радзіму, завочна Валерый Вячаслававіч закончыў Вялікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут па спецыяльнасці інжынер-механік. Некалькі месц працы памяняў, але найбольшы стаж – 15 год – майстрам у райгазе. Цяпер у асноўным займаецца правядзеннем прыроднага газу. За добрасумленную працу яго партрэт змешчаны на Дошцы гонару арганізацыі, неаднаразова ўзнагароджаны граматамі, яшчэ ён – пастаянны ўдзельнік творчых конкурсаў, а ў 2006 годзе заняў першае месца сярод салістаў ў раённым аглядзе мастацкай самадзейнасці і ўзнагароджаны дыпломам. Дарэчы, сям'я Мажынскіх адораная, усе іграюць на музычных інструментах.

Валерый Вячаслававіч разам з жонкай Святланай Аляксандраўнай выхавалі дваіх дзяцей – Вераніку і Уладзіслава. Абодва ўжо дарослыя. Вераніка пасля заканчэння экалагічнага ўніверсітэта імя А. Д. Сахарава працуе малодшым навуковым супрацоўнікам у экалагічным навукова-даследчым цэнтры ў сталіцы. Наведваецца часам і да бацькоў, якія жывуць побач з Міёрмі ў вёсцы Дворышча. Уладзіслаў нядаўна вярнуўся дадому пасля службы ў арміі. Ёсць чым ганарыцца бацькам: ім аб'яўлена падзяка начальніка аддзела пагранічнай службы «Опса» за выхаванне сына,

а непасрэдна Уладзіславу выказана ўдзячнасць за супрацоўніцтва ў пошуку парушальнікаў дзяржаўнай мяжы. Пра тое здарэнне ён расказаў наступнае:

*– Здарылася гэта 21 верасня мінулага года каля дзясяці гадзін вечара. У нарадзе былі ўдваіх і з намі сабака Жора. Як звычайна, патрулявалі пэўны ўчастак, але якраз ён лічыцца адным з небяспечных і прывабных для парушальнікаў. Непадалёк ад сцяжынкі прывязалі чатырохногага сябра, а самі стаіліся, адным словам – выконвалі ўсё, як належыць. Праз некаторы час пачулася шорханне, і Жора насцярожыўся, адразу падумалася: «Праверка – так бывае, калі кантралююць салдат, як тыя нясуць службу». Аднак сабака ўсё больш хваляваўся. Аказалася – людзі каўказскай нацыянальнасці хацелі перабрацца ў Латвію. Ад жаданай мэты яны знаходзіліся ўсяго за 500 метраў! Іх было двое. Як на тое ліха, села зараднае радыёстанцыі, па якой звычайна выклікалі падмогу. Тады, пакуль я парушальнікаў трымаў на «мушцы», мой сябра пусціў ракету, а знак бачны ў радыусе кіламетра. Хутка падаспела трывожная група… За ўмелыя дзеянні атрымаў дзень адпачынку, што дазволіла трапіць на канцэрт любімай рок-групы.*

*Што да астатніх момантаў службы, то спачатку было вельмі нялёгка прызвычаіцца да новага ладу жыцця, абавязкаў, ды ўвогуле, пакуль дакладна зразумелі, што ад нас патрабавалася. Аднак, азірнуўшыся назад, прыходзіць да ўсведамлення вялікая карысць пережытага: з'явіліся новыя сябры, выпрацаваліся такія рысы характару як адказнасць, цягавітасць, павага да кожнага чалавека; калі раней проста ведаў, чытаў і чуў пра Афганістан, бо там служыў і ваяваў тата, то цяпер з асаблівай гордасцю ўсведамляю гэты факт яго біяграфіі, іншыя пачуцці выклікае дата 15 лютага і ўсё, звязанае з гісторыяй нашай краіны.*

«Варта, каб кожны хлопец прайшоў армію. Не трэба баяцца выпрабаванняў, яны толькі загартоўваюць, яшчэ лепш фарміруюць характар», – такое меркаванне выказалі будучым прызыўнікам старшы лейтэнант у запасе, афганец Валерый Вячаслававіч і сяржант-пагранічнік Уладзіслаў Валер'евіч Мажынскія – сын і бацька.

**В. Вішнеўская**